РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ЛЮТАГА 2025 г. ПЯТНІЦА № 26 (30414)

ЗЫХОДЗІЦЬ З ІНТАРЭСАЎ ДЗЯРЖАВЫ

Учора ў Палацы Незалежнасці абмяркоўвалі дакумент, які дакладна вызначыць ролю кіраўнікоў гар- і райвыканкамаў, установіць нарматыўна-прававыя прынцыпы іх дзейнасці. Вынік нарады з удзелам Прэзідэнта, на якой кіраўнік дзяржавы рабіў заўвагі і задаваў пытанні, — адпаведны ўказ можа з'явіцца ўжо ў сакавіку.

(Працяг на 2–3-й стар.)

НОУ-ХАУ

ШЛЯХ У БУДУЧЫНЮ

Інтэлектуальныя тэхналогіі — ключ да эфектыўнага развіцця краіны



IT-тэхналогіі ўвайшлі ў наша штодзённае жыццё — ад аўтаматызацыі бытавых задач да камунікацыі паміж людзьмі, работы і адпачынку. І на ўзроўні эканамічнага развіцця дзяржавы, і на ўзроўні якасці жыцця кожнага грамадзяніна магчымасць выкарыстання сучасных тэхналогій, распрацоўка і ўкараненне лічбавых рашэнняў — аснова дабрабыту і бяспекі.

Напярэдадні свайго 60-гадовага юбілею айчынны флагман у галіне інфармацыйных тэхналогій — Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі (АІПІ) Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — распавёў пра перспектывы развіцця IT-сферы ў Беларусі.

СТАР. 8

МАЛЕНЬКІ ПРЫНЦ З СЯННО СПЯВАЎ НА СЦЭНЕ «МІНСК-АРЭНЫ»

9

НА СЛЫХУ

ЦАНУ ДЫКТУЕ НЕ ЗБОР, А РЫНАК

А ён, што датычыцца аўто, сёння перанасычаны

Навіна аб тым, што з 10 лютага 2025 года з прыняццем адпаведнай пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь змяняецца парадак налічэння стаўкі ўтылізацыйнага збору на транспартныя сродкі (не толькі вырастуць належныя да выплаты сумы, але і пашырыцца пералік тэхнікі, на якую будуць распаўсюджвацца гэтыя тарыфы), сярод аўтааматараў стала рэзананснай. «Аўтамабілі падаражэюць!» — панеслася па сацсетках. Як і ў любых падобных агульных сцвярджэннях, тут ёсць нямала нюансаў, на якія крытыкі ўсяго і ўся свядома закрываюць вочы. Давайце па парадку разбяромся, ці так страшны для простага пакупніка збор, які павялічыўся, як яго малююць, і за якія машыны пераплачваць не давядзецца зусім.

СТАР. 6

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

ЗЫХОДЗІЦЬ З ІНТАРЭСАЎ ДЗЯРЖАВЫ

Гэту тэму кіраўнік дзяржавы ўзнімаў яшчэ падчас рабочай паездкі ў Шклоў у жніўні. Пытанні, якія абмяркоўваліся на нарадзе па пытаннях эфектыўнага развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці Шклоўскага і Аршанскага раёнаў, датычыліся не толькі гэтых раёнаў, а ў цэлым мясцовай вертыкалі ўсёй краіны. Кажучы аб далейшым рэфармаванні сельскай гаспадаркі, Прэзідэнт адзначаў, што трэба ўдзяліць увагу ролі старшынь райвыканкамаў, нарматыўна-прававому рэгуляванню іх дзейнасці, дакладнаму разуменню паўнамоцтваў. Аляксандр Лукашэнка тлумачыў, што гэта неабходна для таго, каб дакладна разумець, што і ад каго могуць патрабаваць старшыні выканкамаў. Акрамя таго, прававое рэгуляванне паўнамоцтваў гэтай катэгорыі службовых асоб, па яго словах, дазволіць пазбегнуць спрэчак наконт ведамаснай падпарадкаванасці і межаў кампетэнцыі.

Праект указа, якім рэгулюецца статус старшыні выканкама базавага ўзроўню, быў разгледжаны на пасяджэнні Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу. Аднак замест гэтага дакумента члены прэзідыума прапанавалі прыняць закон. Але, як гэта часта бывае, перш чым прыняць канчатковае рашэнне, Аляксандр Лукашэнка параіўся, выслухаў меркаванні як вышэйшых службовых асоб, заканадаўцаў, так і непасрэдна тых, хто працуе на месцах. У выніку сышліся на тым, што ўсё ж такі гэта будзе ўказ.

«УЗРОВЕНЬ ВЫКАНАЛЬНІЦКАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ ПАВІНЕН БЫЦЬ НА АДПАВЕДНАЙ ВЫШЫНІ»

«Сёння мы павінны канчаткова абмеркаваць усе пытанні, якія датычацца павышэння ролі раённых і гарадскіх выканкамаў так званага базавага ўзроўню і іх старшынь, — задаў тон размовы, распачынаючы нараду ў Палацы Незалежнасці, кіраўнік дзяржавы. — На пасяджэнні Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу мы нядаўна разгледзелі адпаведны праект указа. Тады прагучала шмат прапаноў, у тым ліку аб тым, каб не выдаваць Указ Прэзідэнта, а прыняць адпаведны закон. Законапраект падрыхтаваны, прадстаўлены мне для ўнясення ў Палату прадстаўнікоў. Давайце яшчэ раз паглядзім, ці ўсе надзённыя пытанні ў ім адлюстраваны, ці ліквідаваны ўсе прабелы, якія сёння перашкаджаюць эфектыўнаму функцыянаванню старшынь рай-, гарвыканкамаў».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што не трэба трымацца за паўнамоцтвы і статус наверсе, каб не аддаць пэўныя паўнамоцтвы ўніз. «Гэта абсалютна непрымальна, — падкрэсліў ён. — **Мы павінны выходзіць з пазіцыі інтарэсаў нашай дзяржавы».**

Па словах Прэзідэнта, павышэнне статусу старшынь базавага ўзроўню раўназначнае шматразоваму ўзмацненню адказнасці за развіццё горада і раёна. «Я ўжо шмат разоў казаў, што мы значна павысім узровень выканальніцкай дысцыпліны ў краіне, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Бачу недапрацоўкі ў гэтым плане, прытым сур'ёзныя». У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы папярэдзіў: калі гэтыя недапрацоўкі не ліквідаваць, будзе вельмі складана выканаць пастаўленыя задачы не толькі ў гэтым годзе, але і ўвогуле ў пяцігодцы.

«Таму ўзровень выканальніцкай дысцыпліны павінен быць на адпаведнай вышыні, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Пры гэтым, разумеючы, што без старшынь гар-, райвыканкамаў мы не вырашым ні адной праблемы, патрабаванні да іх узрастуць. **Але калі мы павышаем патрабаванні да іх, то трэба даваць і паўнамоцтвы, каб яны маглі працаваць.** Усё вельмі проста і зразумела. Вось у сувязі з чым з'явіліся прапановы аб павышэнні ролі старшынь гар-, райвыканкамаў».

Гэтыя прапановы, па словах кіраўніка дзяржавы, павінны пашыраць паўнамоцтвы выканкамаў базавага ўзроўню, іх старшынь для таго, каб істотна перш за ўсё палепшыць эканоміку, узровень жыцця людзей на адпаведнай тэрыторыі.

«РАШЭННІ ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА І СТАРШЫНІ ВЫКАНКАМА АБМЕРКАВАННЮ НЕ ПАДЛЯГАЮЦЬ»

Пры гэтым Прэзідэнт ставіць пытанне, якое, на яго думку, не адназначна ўспрымецца некаторымі катэгорыямі грамадзян.

«Аб адказнасці старшынь выканкамаў базавага ўзроўню за кіраванне па ўсіх кірунках, у тым ліку і прыватным сектарам, — канкрэтызаваў ён. — **А то ў нас атрымліваецца: прыватнік — гэта ўвогуле не дзяржава, гэта «дзяржава ў дзяржаве».** А ў той жа час мы на прыватніка вельмі разлічваем. І іх роля таксама ў вытворчасці, асабліва ў вытворчасці, будзе павышана. **Ну дык старшыня райвыканкама павінен кіраваць, і патрабаваць, і несці адказнасць аднолькава як за прыватны, так і дзяржаўны сектар.** І гэта датычыцца перш за ўсё кадраў. Гэта жорсткае маё патрабаванне. Ад гэтага ніхто не павінен сыходзіць, разважаючы і балбочучы аб нейкім лібералізме. У нас сёй-той яшчэ не наеўся гэтага лібералізму».

Кажучы аб Годзе добраўпарадкавання і пяцігодцы якасці, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што асноўная нагрузка пры рэалізацыі пастаўленых задач кладзецца на рэгіёны і іх кіраўнікоў.

«Ну і што, старшыня райвыканкама будзе кланяцца, хадзіць да кіраўнікоў прыватнага сектара, каб яны, напрыклад, гэтыя задачы вырашалі? — удакладніў беларускі лідар і абгрунтаваў: — **Рашэнні выканаўчага камітэта і старшыні выканкама павінны быць канчатковымі, абмеркаванню не падлягаць.** У плане функцыяналу, які кладзецца на іх».

Таму пры абмеркаванні законапраекта, па словах Прэзідэнта, варта канчаткова вызначыцца па яго форме і змесце, каб старшыні выканкамаў былі яшчэ больш матываваныя на вынік і эфектыўна працавалі.

У гэтай сувязі кіраўнік паставіў перад удзельнікамі нарады пытанні, на якія хацеў пачуць адказы: «Якімі кадравымі, эканамічнымі, іншымі паўнамоцтвамі прапануецца надзяліць мясцовую ўладу, каб даць магчымасць вырашаць надзённыя пытанні і адыгрываць больш прыкметную ролю ў развіцці свайго рэгіёна? Ці патрэбны для гэтага праект закона або больш эфектыўна будзе працаваць указ у залежнасці ад практыкі, якая склалася, і настрою людзей? Галоўнае — прынцыпова прыняць актуальныя і запатрабаваныя рашэнні».

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што ролю асноўнага звяна, якое непасрэдна сутыкаецца з работай з людзьмі, трэба павышаць. «Можа быць, і хапае паўнамоцтваў — тады скажыце, — заклікаў ён. — Тут ёсць і старшыня райвыканкама, ёсць і губернатар, і намеснік Старшыні УНС, у тым ліку і парламентарыі».

Прэзідэнт папрасіў прадметна агучыць пытанні, на якія трэба звярнуць увагу. «У якім ключы будзем дзейнічаць, я сказаў, — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы. — **Не трэба баяцца надзяляць старшынь гар-, райвыканкамаў адпаведнымі функцыямі і паўнамоцтвамі. Спытаем з іх сур'ёзна, ціск будзе на іх вельмі сур'ёзны, але мы павінны даць ім рычагі».**

КАЛЕГІЯЛЬНЫ РАЗГЛЯД І САМАСТОЙНАЕ ПРЫНЯЦЦЕ РАШЭННЯЎ

Як далажыў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ**, праектам закона прадугледжаны два прынцыповыя моманты. «Ён распаўсюджваецца на выканкамы ўсяго базавага ўзроўню, а не толькі раённыя, як было раней, і іх старшынь, — канкрэтызаваў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — І другі момант — большасць новых паўнамоцтваў перадаецца на калегіяльны разгляд выканкамаў, а не аднаасобна старшыні».

Кажучы аб асноўных нововвядзеннях, Дзмітрый Крутой паведаміў, што ў рай-, гарвыканкамаў з'явіцца магчымасць уносіць змяненні ў расходы адпаведнага бюджэту па функцыянальнай класіфікацыі ў межах зацверджанага шараговага памеру, ліміту. «Гэта значыць, памер, ліміт для раённага бюджэту ўстанаўліваецца і на працягу года, у залежнасці ад сітуацыі, па даходнай, па расходнай частцы выканкам мае права ўносіць пэўныя змяненні ў адпаведныя рэсурсы, — патлумачыў ён. — Прадугледжана магчымасць распараджацца рэштай сродкаў адпаведнага бюджэту, калі добра спрацавалі, сэканомілі. Гэта права менавіта старшыні выканкама як стымуляцыйная норма і мера».

Пры гэтым кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта ўдакладніў, што, натуральна, не ўсе раёны гэтым будуць карыстацца. Але ў тых, што будуць дасягаць добрых вынікаў, такая магчымасць з'явіцца.

Яшчэ адно нововвядзенне — прыцягненне суб'ектаў гаспадарання да добраўпарадкавання

Прэзідэнт правёў нараду па пытаннях удасканалення прававога рэгулявання статусу старшыні выканкама базавага ўзроўню

і ўтрымання тэрыторый. «Згодна з дзеючым заканадаўствам, гэта мера дзейнічае адносна толькі санітарнага стану адпаведных зямельных участкаў, цяпер — добраўпарадкавання ў больш шырокім сэнсе», — канкрэтызаваў ён.

Акрамя таго, на рай-, гарвыканкамы прапаноўваецца ўскласці прыняцце рашэнняў аб зносе аварыйных, закінутых, старых збудаванняў, у тым ліку без праектнай дакументацыі. Прадугледжана дазволіць выканкамам базавага ўзроўню больш шырока выкарыстоўваць карысныя выкапні, якія здабываюцца на тэрыторыі адпаведнага раёна. «Таксама ў законе, каб не было ніякіх злоўжыванняў, у тым ліку карупцыйных, устаноўлена абмежаванне па цане, не вышэйшай за сабекошт здабычы гэтых карысных выкапняў», — удакладніў Дзмітрый Крутой.

На рай- і гарвыканкамы прапаноўваецца ўскласці прыняцце рашэнняў аб дзяржаўных закупках, але з адной крыніцы — у арганізацый з доляй дзяржуласнасці. На ўзроўні выканкамаў прадугледжана прыняцце рашэнняў і па самавольна занятых землях. Як удакладніў Дзмітрый Крутой, маюцца на ўвазе тыя рашэнні, якія не патрабуюць узгаднення з Прэзідэнтам, у выпадку, калі адпаведны аблвыканкам такое права ім дэлегуе.

Вераніка КАНЮТА.
Фота БелТА.

У тэму

«Працаваць на тое, каб краіна рухалася далей»

Як адзначыў у размове з журналістамі **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Дзмітрый КРУТОЙ**, па выніках нарады большасцю ўдзельнікаў была ўнесена прапанова вярнуцца да формы ўказа, падпісаць яго максімальна хутка.

«Указам № 1 аб'яўлены Год добраўпарадкавання, і цяпер на ўзроўні раёнаў фарміруюцца маштабныя планы, звязаныя з правядзеннем адпаведных мерапрыемстваў, — агучыў ключавыя абгрунтаванні Дзмітрый Крутой. — Для аператыўнасці, натуральна, дакумент патрэбен хутчэй. Улічваючы, што на ўзроўні старшынь райвыканкамаў з'явяцца новыя паўнамоцтвы і новыя магчымасці па ўцягненні абсалютна ўсіх суб'ектаў гаспадарання, нашага насельніцтва да гэтага працэсу, зразумела, нарматыўна трэба аформіць усё гэта значна хутчэй».

Акрамя таго, па яго словах, указ дазваляе ў канцэнтраваным выглядзе з абсалютна розных сфер і дакументаў імплементаваць адпаведныя нормы, якія датычацца ўзмацнення паўнамоцтваў старшынь выканкамаў базавага ўзроўню. «Калі б мы ўносілі змяненні ў Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні», як прапаноўвалася мінулы раз, гэта патрабавала б змянення яшчэ дзевяці падзаконных дакументаў, шэрагу кодэксаў, — патлумачыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Натуральна, уключаць туды непрапрацаваныя практыкай нормы было б неразумна. Прэзідэнт з гэтым пагадзіўся, таму канструкцыя наступная: пастараемся да 1 сакавіка падпісаць указ. Да канца года ён папрацуе».

Карэкціроўкі закрануць і Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», куды будзе ўключана большая колькасць новаўвядзенняў, звязаная не толькі з паўнамоцтвамі старшынь гар-, райвыканкамаў. «Гэта будуць комплексныя змяненні, і Прэзідэнт сёння ўвогуле запатрабаваў выкласці яго (закон. — «Зв.») у новай рэдакцыі, — удакладніў Дзмітрый Крутой. — З 2010 года туды ўжо ўнесена 14 змяненняў, якія робяць дакумент даволі складаным. Улічваючы, што гэта будзе комплексная праўка нашага закона, нормы Указа аб паўнамоцтвах старшынь гар-, райвыканкамаў, ужо да канца года адпрацаваныя на практыцы, будуць проста імплементаваны ў наступным годзе або ў канцы гэтага года. Нарматыўная канструкцыя пакуль выбрана такая».

Што датычыцца паўнамоцтваў старшынь выканкамаў, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыў, што ўсе прапановы беларускім лідарам былі падтрыманы. Сярод іх — і тое, што кандыдатуры кіраўнікоў тэрытарыяльных органаў усіх ведамстваў, акрамя Камітэта дзяржбяспекі, ключавых арганізацый раёна ўсіх форм уласнасці будзе ўзгадняць непасрэдна старшыня гар-, райвыканкама.

Старшыня Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта Анатоль ІСАЧАНКА звярнуў увагу на тое, што тэма, якая ўзнімалася падчас нарады ў кіраўніка дзяржавы, абмяркоўваецца ўжо на працягу некалькіх месяцаў. «Напэўна, сам час падштурхнуў да гэтага, — лічыць ён. — У цэлым, падыходы адобраны».

Анатоль Ісачанка акцэнтаваў увагу на галоўным пасыле кіраўніка дзяржавы: «Разам з тым, што мы ўзмацняем паўнамоцтвы старшынь райвыканкамаў, гарвыканкамаў, трэба ўзмацніць і адказнасць старшынь за іх канкрэтную работу. Мы павінны сёння мабілізавацца і працаваць на тое, каб краіна рухалася далей. А для гэтага патрэбны пэўныя паўнамоцтвы. Гэта галоўны лейтматыў таго, што трэба зрабіць».

Пры гэтым старшыня Магілёўскага аблвыканкама адзначыў, што ўсё для выканання сваіх службовых абавязкаў ёсць. «Але жыццё не стаіць на месцы, яно рухаецца, і, вядома, ёсць пэўныя пытанні, якія трэба карэкціраваць, — лічыць ён. — Як кажа наш Прэзідэнт, бярыце ад зямлі тое, што сёння патрэбна. І тое, што неабходна ў першую чаргу для нашых людзей, каб жыццё было больш камфортным і добраўпарадкаваным. Выходзячы з гэтага, і рыхтуецца дакумент».

Па словах **члена Савета Рэспублікі, старшыні Ваўкавыскага райвыканкама Дзмітрыя ЗАХАРЧУКА**, кіраўнік дзяржавы не раз звяртаў увагу на тое, што ўжо пара дэлегаваць функцыі ўлады на месцах. «Старшыня выканкама павінен з'яўляцца прэзідэнтам на сваёй тэрыторыі, бо яму больш відаць, якімі рычагамі на месцы ўздзейнічаць на тыя ці іншыя масы, — заўважыў ён. — Таму лічу правільным, што кіраўнік дзяржавы заклапочаны дадзеным заканадаўчым прадуктам, каб узмацніць ролю старшыні на месцы».

Сенатар звярнуў увагу, што ўсе роўныя перад заканадаўствам. Датычыцца гэта, па яго словах, і прыватнага бізнесу. «У краіне — Год добраўпарадкавання, у нас усюды павінна быць эстэтычна акуратна, як у кожнага дома, — прывёў прыклад Дзмітрый Захарчук. — Чым прыватнік павінен адрозніваца ад дзяржаўнага прадпрыемства? У асноўнай масе прыватны бізнес падтрымлівае парадак, але ёсць выключэнні, як у любым з правіл. Тады ўключаецца адміністрацыйны рэсурс».

Па словах **старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандра ТУРЧЫНА**, у краіне выбудавана сістэма дзяржкіравання. «Зразумела, што любая сістэма не статычная, яна заўсёды патрабуе пэўных змяненняў у сувязі са зменамі ў краіне, свеце, — удакладніў ён. — Таму нарада па гэтай тэматыцы ўжо не першая ў кіраўніка дзяржавы».

Аляксандр Турчын перакананы, што цэлы шэраг аспектаў, якія плануецца аформіць заканадаўча, дапаможа старшыням выканкамаў больш эфектыўна вырашаць пастаўленыя перад імі задачы. «Але не трэба ніколі забываць, што ёсць правы, а ёсць абавязкі, — нагадаў ён. — Таму трэба вельмі ўважана падыходзіць да сваіх правоў, бо любое тваё рашэнне цягне за сабой тыя ці іншыя наступствы».

Па словах старшыні Мінаблвыканкама, ёсць агульнакраінавыя задачы, якія павінны вырашаць усе разам, няважна, якой формы ўласнасці суб'ект гаспадарання. «Патрэбен будзе час, каб паглядзець, як нормы, закладзеныя ў гэтым дакументе, будуць працаваць на практыцы, — лічыць кіраўнік Мінскай вобласці. — Ёсць цэлы шэраг момантаў, якія дазволяць палепшыць работу старшынь выканкамаў. Вядома, усё залежыць і ад асобы кіраўніка».

Старшыня Шклоўскага райвыканкама Сяргей БАРТАШ распавёў, што прыпадрыхтоўцы комплекснага дакумента аб узмацненні паўнамоцтваў выканкамаў базавага ўзроўню былі разгледжаны і ўлічаны прапановы з месцаў. Па яго словах, абмеркаванню на ўзроўні Прэзідэнта папярэднічаў падрабязны разгляд усіх прапаноў, якія паступілі на ўзроўні спецыялістаў, у тым ліку мясцовых органаў улады.

«Калі будзе прыняты гэты дакумент, у нас стане больш магчымасцяў, каб даць чарговы штуршок развіццю раёнаў, у тым ліку кадраваму патэнцыялу, і ў далейшым працаваць у гэтым кірунку, — падкрэсліў Сяргей Барташ. — Мы зможам даць большы вынік: і той, які самі ад сябе чакаем, і той, якога ад нас чакае народ. Будзе толькі станоўчы эфект».

Па словах старшыні Шклоўскага райвыканкама, ёсць разуменне таго, што новыя паўнамоцтвы прадугледжваюць і ўзмацненне адказнасці. «Зразумела, што попыт будзе жорсткі, і мы да гэтага гатовы, — сказаў ён. — Мы для таго і ёсць на гэтых пасадах, каб адказваць за ўсе свае дзеянні і за выкананне тых даручэнняў, якія нам даюцца».

ГІСТАРЫЧНАЯ БУДОЎЛЯ МУЗЕЯ: АДЛІК ПАЧАЎСЯ

Будаўніцтва Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі і стварэнне парку Народнага адзінства плануецца ажыццявіць у 2025—2027 гадах у сталіцы краіны

Рашэнне пра гэта прыняў кіраўнік дзяржавы, яно зацверджана асобным указам 5 лютага. Справа адметная ад пачатку, бо праз свой удзел у ёй могуць зрабіць унёсак у гісторыю і культуру краіны людзі ва ўзросце да 31 года. Статус — «Усебеларуская маладзёжная будоўля» — падкрэслівае неабходнасць далучэння да нацыянальнай спадчыны пакалення, якое скіравана на будучыню.

Навіна пра тое, што новы будынак гістарычнага музея з'явіцца ў Мінску на вуліцы Арлоўскай, узрушыла як людзей, якія былі знаёмыя з яго экспазіцыяй і актыўна цікавіліся выстаўкамі, так і спецыялістаў, даследчыкаў, гісторыкаў.

— Для любой краіны гістарычны музей — асноўны сярод іншых музеяў. У залежнасці ад таго, наколькі дзяржава клапоціцца пра якасць і насычанасць экспанатамі гістарычнага музея, можна меркаваць, наколькі для краіны дарагая яе спадчына, усё тое, што звязана з мінулым, — адзначыў **генеральны дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі Аляксандр ХРАМЫ.** — У нашай краіне на працягу 30 гадоў незалежнасці вялася планамерная работа па стварэнні новых музеяў. Мы вельмі рады, што гэты працэс заўсёды быў на кантролі ў кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнкі. Цяпер настаў час, каб у нас з'явіўся вельмі сучасны і перадавы гістарычны музей, які б увабраў у сябе ўсю нашу мінуўшчыну і даў магчымасць пазнаёміцца з ёй усім зацікаўленым, расказваў бы пра гераічныя подзвігі асоб, якія спрыялі з'яўленню і развіццю асобнай краіны — Рэспублікі Беларусь. Сучасная экспазіцыя патрэбна і для таго, каб кожны жыхар нашай краіны мог ганарыцца сваёй Радзімай, а яе госці даведваліся б, што ёсць вельмі таленавітыя і працалюбівыя людзі — беларусы, якія заўсёды шчыра запрашаюць да сябе: у нас можна добра адпачыць, атрымаць асалоду ад цікавых мерапрыемстваў, якіх ладзіцца даволі багата па ўсёй краіне. Дзякуючы сучаснаму гістарычнаму музею можна пазнаёміцца са старажытнай Беларуссю, зразумець, што для яе важна ў цяперашні час, зазірнуць у будучыню.

Беларусь, якую мы ведаем і любім, паўстала неаднойчы, яна прайшла стагоддзі шляху, на працягу якога асэнсоўвала свае карані і каштоўнасці, каб усвядоміць права на сваю дзяржаўнасць. Усё гэта павінна адлюстраваць новая экспазіцыя музея, лічыць **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў, доктар гістарычных навук Ігар МАРЗАЛЮК:**

— Гэта натхняльная навіна, таму што гісторыя — грунт і падмурак дзяржавы. Нацыянальны гістарычны музей павінен адлюстраваць усе этапы існавання нашага народа і яго змагання за сваю незалежнасць, з усімі драматычнымі і трагічнымі падзеямі, якія выпалі на яго долю. Тое, што захоўваецца ў музеі, павінна быць адлюстравана шырока праз тэхнічныя сродкі, якія дазваляюць зрабіць сучасную экспазіцыю. І не сумняваюся ў тым, што яна будзе створана на сусветным узроўні.

Ларыса ЦІМОШЫК.

АКЦЭНТЫ

ГАСПАДАРСКІ ПАДЫХОД

«Пераважаюць сацыяльныя праекты для больш камфортнага жыцця людзей»: эксперты — аб Дзяржінвестпраграме на 2025 год

Кіраўнік дзяржавы днямі падпісаў Указ № 49, якім зацверджана Дзяржаўная інвестыцыйная праграма на 2025 год. Аб значнасці аб'ектаў, прапісаных у дакуменце, для нас з вамі — звычайных грамадзян — мы даведаліся ў экспертаў. Што і дзе будзем будаваць? Падрабязней — у нашым матэрыяле.

БОЛЬШ ЗА ДВА МЛРД РУБЛЁЎ НА 82 АБ'ЕКТЫ

У Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграме на 2025 год пераважаюць праекты сацыяльнай накіраванасці для больш камфортнага жыцця людзей. На гэтым акцэнтаваў увагу **першы намеснік міністра эканомікі Андрэй КАРТУН:**

— Дзяржінвестпраграма прымаецца штогод. Тут няма інвестыцыйных праектаў у класічным разуменні, гэта значыць камерцыйных, гэта дзяржаўныя праекты сацыяльнага і інфраструктурнага характару. Сутнасць Дзяржінвестпраграмы менавіта ў выкананні сацыяльных абавязацельстваў, паляпшэнні інфраструктуры, каб забяспечыць больш камфортныя ўмовы жыцця людзей. Калі казаць пра суму, то на фінансаванне аб'ектаў прадугледжана 2,2 мільярда рублёў.

Усяго ў Дзяржінвестпраграме 82 аб'екты.

— Можна сказаць, што каля 70 % — сацыяльнай накіраванасці, уплываюць наўпрост на людзей. Напрыклад, будаўніцтва станцый абезжалезвання — мы плануем у далейшым працягваць гэту работу. Арэндная жыллё будзе пабудавана для катэгорый, якія маюць патрэбу, за кошт гэтых сродкаў у 2025 годзе, — адзначыў першы намеснік міністра эканомікі.

Ён нагадаў, што быў прыняты ўказ, які дае паўнамоцтвы мясцовым органам улады вызначаць, якія спецыяльнасці ў раёне найбольш запатрабаваны, і ўстанаўліваць, што гэта катэгорыя першая атрымлівае права на арэнднае жыллё. Таксама ён звярнуў увагу, што ў планах — рэканструкцыя раённых бальніц, мастоў, дарог, у большай ступені мясцовых.

— Каля паловы аб'ектаў, якія ўвайшлі ў Дзяржінвестпраграму, будуць завершаны сёлета, астатнія пяройдуць на 2026-ы, — адзначыў Андрэй Картун.

Ён падкрэсліў, што дзякуючы гэтаму дакументу на эканоміку працуюць унутраныя інфраструктурныя інвестыцыі:

— Мы сабралі ўсе прапановы мясцовых органаў улады і згрупавалі аб'екты такім чынам, каб у першую чаргу завяршыць работу па ўжо пачатых праектах, новых практычна не дадавалі.

ГОДНА ЎПРЫГОЖАЦЬ ПЯЦІГОДКУ ЯКАСЦІ І ГОД ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ

Рэалізацыя Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы на 2025 год дасць магчымасць палепшыць якасць медыцынскай дапамогі пацыентам. Такое меркаванне выказаў у гутарцы з журналістамі **намеснік міністра аховы здароўя Аляксандр СТАРАВОЙТАЎ.**

Паводле яго слоў, Дзяржінвестпраграма ўключае тыя аб'екты, якія неабходны ў першую чаргу. За кошт сродкаў праграмы ў 2025 годзе ў тым ліку будуць будавацца і рэканструявацца бальніца ў Паставах, абласны анкалагічны дыспансер у Гродне, новыя карпусы абласной бальніцы ў Брэсце і РНПЦ дзіцячай анкалогіі ў Бараўлянах, рэабілітацыйны цэнтр у Аксакаўшчыне.

— Дзяржаўная інвестыцыйная праграма ўключае ў сябе ўсе аб'екты, якія годна ўпрыгожаць пяцігодку якасці і Год добраўпарадкавання, — сказаў намеснік міністра аховы здароўя.

Акрамя непасрэдна медыцынскай часткі, будзе прыведзена ў парадак і ўся тэрыторыя, на якой знаходзяцца адпаведныя аб'екты аховы здароўя.

— Сродкі, якія прадугледжаны для гэтых будоўляў, пойдуць на паляпшэнне якасці аказання медыцынскай дапамогі нашым пацыентам, — упэўнены Аляксандр Старавойтаў.

ДАДАТКОВЫ КАТАЛІЗАТАР РАЗВІЦЦЯ РАЁНАЎ

Рэалізацыя трох найважнейшых праектаў у сферы дарожна-маставога будаўніцтва, уключаных у Дзяржаўную інвестыцыйную праграму на 2025 год, стане дадатковым каталізатарам развіцця раёнаў Гомельскай вобласці і ў цэлым рэгіёна, лічыць **генеральны дырэктар РУП «Гомельаўтадар» Дзяніс ЯСЬКО.**

За кошт сродкаў Дзяржінвестпраграмы ў 2025 годзе ў паўднёва-ўсходнім рэгіёне вядуцца работы па рэканструкцыі наступных аб'ектаў: аўтамабільная дарога М10 граніца РФ — Гомель — Кобрын (1-я чарга), мост праз раку Прыпяць у Мазыры, мост праз раку Сож каля Веткі. РУП «Гомельаўтадар» выступае заказчыкам гэтых аб'ектаў.

— Увод кожнага з гэтых праектаў будзе спрыяць эканамічнаму развіццю раёнаў Гомельскай вобласці і ў цэлым рэгіёна. Так, мост праз Прыпяць дазволіць Мазырскаму і Калінкавіцкаму, а мост праз Сож — Веткаўскаму і іншым найбліжэйшым раёнам эфектыўна развіваць грузавыя і пасажырскія аўтамабільныя перавозкі, удасканаліць лагістыку для вытворчай і сацыяльнай сфер. Што датычыцца ўчастка М10, то гэта заўсёды даволі ажыўленая магістраль. Сутачная інтэнсіўнасць руху вар'іруецца ад 7 да 10 тысяч адзінак транспарту, — падкрэсліў Дзяніс Ясько.

Ён звярнуў увагу і на пытанні бяспекі:

— Напрыклад, маставыя збудаванні 1960-х, 1970-х гадоў пабудовы былі разлічаны на іншую нагрузку і прапускную здольнасць і ўжо страцілі свой рэсурс. Вядома, новыя будынкі будуць адпавядаць усім сучасным патрабаванням і рэаліям.

Кіраўнік патлумачыў, што работы па рэканструкцыі моста праз Прыпяць даўжынёй больш за 920 метраў, пабудаванага ў 1958 годзе, падзелены на дзве чаргі: разбор існуючага збудавання і будаўніцтва новага моста на ранейшым месцы.

Гендырэктар запэўніў, што ўсе работы ідуць па графіку:

— У чацвёртым квартале 2025 года плануецца пуск руху па новым месце, а работы па завяршэнні будаўніцтва будуць працягвацца да 26 мая 2026 года.

Праз раку Сож у Веткаўскім раёне на аўтадарозе Р30 Гомель — Ветка — Чачэрск — Ямнае будзе ўзведзены новы мост. Яго працягласць перавысіць 535 метраў (гэта практычна на 10 метраў больш, чым наяўнае збудаванне), а шырыня складзе 10 метраў.

Яшчэ адзін ключавы аб'ект інвестпраграмы на карце рэгіёна — участак трасы М10 граніца Расійскай Федэрацыі — Гомель — Кобрын.

— Уся рэканструкцыя адрэзка за 85 км ад Рэчыцы да Калінкавічаў — гэта пяць чэргаў. Пачалі першую — за 16,8 км ад Рэчыцы да Каравацічаў, — дадаў кіраўнік.

Па матэрыялах БелТА і sb.by

Даслоўна

Алена ФУРС, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:

— У бягучым годзе, накіраваным на паляпшэнне сферы добраўпарадкавання, Дзяржаўная інвестыцыйная праграма набывае асаблівую значнасць. Яна ўключае ў сябе аб'екты, якія годна ўпрыгожаць пяцігодку якасці і стануць чарговым доказам таго, што наша краіна нацэлена выключна на развіццё і ўдасканаленне ва ўсім.

У тым ліку гэты важны дакумент пацвярджае сацыяльную арыентаванасць нашай дзяржавы. Яго асноўныя кірункі датычацца, у першую чаргу, павышэння якасці жыцця людзей.

«Грошы трэба траціць з розумам!» — гэтая праверэная часам выснова не губляе сваёй актуальнасці. Асабліва ва ўмовах пастаяннай сусветнай канфрантацыі, санкцыйнага ціску, войнаў і канфліктаў, калі вельмі важна захаваць і прымножыць наш эканамічны патэнцыял, забяспечыць стабільны, кантраляваны і паступальны рух наперад.

Галоўнае патрабаванне Аляксандра Лукашэнкі застаецца нязменным: кожны ўкладзены рубель павінен даваць максімальную аддачу. Такі гаспадарскі падыход да размеркавання наяўных рэсурсаў, які праяўляе Прэзідэнт Беларусі, з'яўляецца моцнай асновай для якасных пераўтварэнняў, якія дапамагаюць рабіць нашу краіну яшчэ лепшай, а жыццё беларусаў — больш камфортным і паспяховым.

Сяргей КЛІШЭВІЧ, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў:

— Зразумела, што асноўныя кірункі дакумента датычацца паляпшэння жыцця людзей. Але ўздзейнічае, безумоўна, і геапалітычная сітуацыя, якая датычыцца Беларусі і адбіваецца на развіцці нашай эканомікі, а таксама абароннага сектара. Таму, вядома, значная ўвага аддаецца якраз развіццю нашага прамысловага патэнцыялу, інвестыцый у сродкі вытворчасці. У тое, што нам дазволіць у будучыні не проста захаваць дасягнуты ўзровень эканамічнага развіцця, але і ва ўмовах пастаяннай сусветнай канфрантацыі, санкцыйнага ціску, войнаў і канфліктаў забяспечыць стабільнае, кантраляванае паступальнае развіццё нашай краіны. Такім чынам, забяспечваючы нармальнае жыццё беларусаў, калі перакладаць на простую мову. Улічваючы сітуацыю, гаворка не ідзе пра празмернасці. Тым не менш усе ключавыя аспекты, такія як медыцына, адукацыя, даступныя і камфортныя ўмовы пражывання, адлюстраваны ў дакуменце. І гэта нягледзячы на спробы задушыць Беларусь эканамічна. І якраз нашы інвестыцыйныя праграмы дэманструюць, што гэтыя спробы — не проста беспаспяховыя, яны сёння актывізуюць беларусаў на большую працу, развіццё нашага прамысловага сектара, цеснае супрацоўніцтва з саюзнікамі, такімі як Расія, Кітай і іншымі дзяржавамі. Таму, вядома, пункты Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы яшчэ раз пацвярджаюць канстытуцыйную мэту развіцця нашай краіны — гэта сацыяльна арыентаваная дзяржава.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Сяргей КАВАЛЬЧУК:

«СПАРТЫЎНАЯ ГАЛІНА ГАТОВА ПАКАЗВАЦЬ ДАСТОЙНЫЯ ВЫНІКІ»

Што абмяркоўвалі на калегіі Міністэрства спорту і турызму

Вынікі працы за 2024 год і новыя сёлетнія задачы акрэслілі на калегіі Міністэрства спорту і турызму. Удзел у пасяджэнні калегіі прыняў намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.

«У краіне, дзякуючы мудрай, грамотнай, паслядоўнай палітыцы кіраўніка дзяржавы, створаны ўсе ўмовы для заняткаў спортам. Мы сёння ганарымся тымі дасягненнямі, якія ёсць у сферы фізічнай культуры і спорту. Галіна гатова паказваць дастойныя вынікі па ўсіх відах спорту і на міжнароднай арэне», — адзначыў **міністр спорту і турызму Сяргей КАВАЛЬЧУК.** Галоўнымі стартамі ў мінулым годзе былі Алімпійскія гульні ў Парыжы, дзе беларускія спартсмены, нягледзячы на ўсе абмежаванні, выступілі дастойна. Унікальнае дасягненне на Паралімпійскіх гульнях паказаў Ігар Бокій. А цяпер — уся ўвага да зімовых Алімпійскіх гульняў 2026 года. «Мы бачым тую сітуацыю, якая складваецца ў адносінах да нашага спорту. Міжнародны алімпійскі камітэт прызнаў нядаўнюю Генеральную асамблею нашага НАК. Мы бачым, што дынаміка станоўчая, спартсмены дапускаюцца да спаборніцтваў, няхай пакуль у нейтральным статусе. Але ў некаторых відах спорту нашы спартсмены дастойна прадстаўляюць нашу краіну», — падкрэсліў Сяргей Кавальчук. Зараз допуск на міжнародныя старты ёсць у прадстаўнікоў 37 відаў спорту.

Міністр спорту і турызму адзначыў, што такога ўзаемадзеяння ў спартыўнай галіне на прасторы Саюзнай дзяржавы, як у гэтыя гады, раней не было ніколі ў гісторыі. Па яго словах, назіраецца цікавасць і іншых краін да ўдзелу ў беларуска-расійскіх спаборніцтвах.

На наступным тыдні ў РЦАП па зімовых відах спорту «Раўбічы» пройдзе Кубак мацнейшых па біятлоне, затым аналагічныя спаборніцтвы пройдуць па канькабежным спорце. На люты таксама запланавана сумесная калегія Міністэрства спорту і турызму Беларусі і Міністэрства спорту Расіі, дзе будуць вызначаны планы на лета.

Сяргей Кавальчук падкрэсліў, што створаны належныя ўмовы для заняткаў спортам. У кожнай вобласці культывуецца ад 40 да 50 відаў спорту, у мінулым годзе павялічылася колькасць спартыўна-масавых мерапрыемстваў, працягваецца работа па развіцці адпаведнай інфраструктуры. Летась быў адкрыты басейн міжнароднага стандарту, рэканструяваныя стадыён «Трактар» і фізкультурна-аздараўленчы комплекс у Дзяржынску. У мінулым годзе быў адкрыты інтэрнат БДУФК. Праводзяцца рамонтныя работы ў шэрагу іншых спартыўных аб'ектаў.

Па словах міністра спорту і турызму, галіна развіваецца плённа, планамерна, без узрушэнняў. «Трэба працягваць рухацца сваім уласным шляхам, наладжваць сістэму ад дзіцячага спорту да спорту вышэйшых дасягненняў, развіваць супрацоўніцтва з тымі краінамі, якія падтрымліваюць сяброўскія адносіны», — канстатаваў Сяргей Кавальчук.

Валерыя СЦЯЦКО.

ПЛЮС У КАШАЛЬКУ

ЗАРОБКІ СЯРЭДНЯГА МЕДПЕРСАНАЛУ ПАВЫСЯЦЦА

Прэзідыум Саўміна прыняў рашэнне аб павелічэнні памераў надбаўкі за працу ў сферы аховы здароўя медыцынскім работнікам з сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыяй.

У прэс-службе ўрада паведамілі, што Міністэрствам аховы здароўя 24 студзеня 2025 года была прынята пастанова № 9 «Аб змяненні пастановы Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 13 чэрвеня 2019 г. № 52», якая прадугледжвае павышэнне аплаты працы ўрачоў-спецыялістаў. Пры гэтым памеры заработнай платы сярэдняга медперсаналу захаваны на ранейшым узроўні.

— Разгледзеўшы дадзеную пастанову, Прэзідыум Саўміна прыйшоў да высновы, што ў дадзеным выглядзе прынятая пастанова не ў поўнай меры ўлічвае ўнёсак сярэдняга медыцынскага персаналу ў сферу аховы здароўя і не цалкам адпавядае даручэнню кіраўніка дзяржавы аб збалансаваным росце заработнай платы ўсіх катэгорый работнікаў, — патлумачылі ва ўрадзе.

Таму для справядлівага ўліку інтарэсаў гэтай катэгорыі медыцынскіх работнікаў, а таксама забеспячэння збалансаванага росту ўзроўню аплаты працы работнікаў галіны Прэзідыум Саўміна даручыў Міністэрству аховы здароўя сумесна з Мінфінам, Мінпрацы і сацабароны ў трохдзённы тэрмін забяспечыць унясенне змяненняў у адпаведную пастанову ў частцы павелічэння ў 2025 годзе памераў надбавак і за працу ў сферы аховы здароўя медыцынскім работнікам з сярэдняй спецыяльнай медыцынскай адукацыяй.

САЦЫЯЛЬНЫ КЛОПАТ

ВАЖКАЯ ПАДТРЫМКА

Якія змяненні пры пераездзе і працаўладкаванні беспрацоўных у сельскай мясцовасці?

Дарэчы, дзейнічаюць яны з сённяшняга дня — 7 лютага.

У новай рэдакцыі прынята Інструкцыя аб парадку і ўмовах аказання садзейнічання ў перасяленні беспрацоўных і членаў іх сем'яў у сувязі з пераездам у іншую мясцовасць адпаведнай пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, расказалі ў прэс-службе ведамства.

У прыватнасці, інструкцыяй прадугледжваецца аказанне фінансавай падтрымкі беспрацоўным грамадзянам пры перасяленні ў сельскую мясцовасць.

Аб якой суме ідзе гаворка?

Гэтая падтрымка аказваецца ў памеры 9-кратнай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, які дзейнічае на дату працаўладкавання. 31 лютага 2025-га памер такой дапамогі складае 4 028,76 рубля.

Што прадугледжвае механізм рэалізацыі названай меры?

Як патлумачылі ў Мінпрацы, неабходна заключэнне трохбаковага дагавора паміж органам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, беспрацоўным і наймальнікам аб перасяленні беспрацоўнага і членаў яго сям'і ў сувязі з пераездам на працу ў іншую мясцовасць, пасля чаго выплачваецца адпаведная дапамога і ажыццяўляецца кантроль за выкананнем дагаворных абавязацельстваў.

— Пастанова прынята ў мэтах прыцягнення і замацавання кадраў на сяле, аказання дадатковай падтрымкі тым, хто ўладкоўваецца на працу ў сельскую мясцовасць, — дадалі ў Мінпрацы. — Пастанова ўступае ў сілу з 7 лютага 2025 года.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

КРАЕВУГОЛЬНАЕ ЖЫЛЛЁВАЕ ПЫТАННЕ

Карэспандэнт «Звязды» папрысутнічала на прыёме грамадзян, які правёў старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ

Звароты, з якімі прыйшлі мінчане да мэра сталіцы, датычыліся павелічэння пенсій, працаўладкавання, прадастаўлення незанятага дадатковага зямельнага ўчастка, паляпшэння жыллёвых умоў для шматдзетных сем'яў і не толькі.

Так, сям'я з трыма дзяцьмі з Мінска звярнулася да старшыні Мінгарвыканкама ў сувязі з адмовай адміністрацыі Фрунзенскага раёна паставіць на ўлік сям'ю як шматдзетную, якая мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у сувязі з іх пагаршэннем — у кватэры прапісалася маці мужа. Сям'я, ў складзе шасці чалавек пражывае ў кватэры плошчай каля 58 квадратных метраў.

Заяўнікі звярнуліся з жаданнем абскардзіць гэтую адмову. «Мы шматдзетная сям'я. Дзеці ў сям'і разнаполыя», — расказала жанчына.

Аднак гэта, па словах **начальніка ўпраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Алены ЛУКАШЭВІЧ,** не з'яўляецца падставай для пастаноўкі на ўлік. «Тое, што датычыцца разнаполых дзяцей, не з'яўляецца падставай для пастаноўкі на ўлік, бо кватэра двухпакаёвая», — адзначыла яна.

Ёсць яшчэ адзін нюанс. «Патрэба ўзнікла ў сувязі з прапіскай маці гаспадара, якая працаздольная. Згодна з заканадаўствам, гэта з'яўляецца тым відам пагаршэння жыллёвых умоў, які цягне за сабой пяцігадовую забарону на пастаноўку на ўлік. Гэта прадугледжвае артыкул 37 Жыллёвага кодэкса. Рэалізаваць права на прыняцце на ўлік у такім выпадку можна па заканчэнні пяці гадоў з даты пагаршэння жыллёвых умоў», — адзначыў Уладзімір Кухараў.

Міхаіл Міхайлавіч звярнуўся з просьбай растлумачыць пытанне прызначэння і выплаты пенсіі. «Я зарэгістраваны ў Івацэвіцкім раёне. Пенсіённая справа знаходзіцца там. Жыву тут, у Мінску. Дваццаць гадоў працую ў Мінску. У мяне вялікі стаж, але каэфіцыент мне нават да адзінкі не паднялі», — кажа заяўнік.

«Вам неабходна звярнуцца туды, дзе вам налічваюць пенсію. Сёння рэгуляваць памер выплат у сувязі з тым, што вы не знаходзіцеся на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, мы не можам», — патлумачыў кіраўнік горада.

Мінчанка звярнулася да Уладзіміра Кухарава з пытаннем арэнднага жылля. Паводле яе слоў, адміністрацыя Фрунзенскага раёна скасавала з ёй дагавор найму арэнднага жылля з-за таго, што яна спыніла працоўныя адносіны з арганізацыяй, якая хадайнічала аб яго прадастаўленні.

«Арэнднае жыллё вам было прадастаўлена на перыяд працоўных адносін з папярэднім працадаўцам. Згодна з артыкулам 114 Жыллёвага кодэкса, дагавор найму жылля, заключаны на перыяд працоўных адносін, спыняецца ў выпадку іх скасавання з арганізацыяй, якая прадаставіла такое жыллё альбо хадайнічала аб гэтым, — адзначыў старшыня Мінгарвыканкама. — Вы маеце права прэтэндаваць на арэнднае жыллё па хадайніцтве ўстановы, у якой вы працуеце. У жыллёвым комплексе «Магістр» на сённяшні дзень яшчэ ёсць незаселеныя кватэры, таму рэктар ВНУ, у якой вы працуеце, павінен звярнуцца з гэтым пытаннем у Міністэрства адукацыі», — падкрэсліў старшыня Мінгарвыканкама.

Яна ВАЛАСАЧ.

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания
• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

Извещение о проведении публичного электронного аукциона

Организатор электронного аукциона	ООО «Индустрия Инноваций», УНП 291442411, г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by
Продавец	ЗАО «АВАНГАРД ЛИЗИНГ», УНП 191257170, 220028, г. Минск, ул. Полтавская, д. 10

Предмет публичных торгов в форме электронного аукциона

Лот №	Наименование	Начальная цена с учетом НДС, в долл. США в эквиваленте по курсу НБ РБ на день проведения электронного аукциона
1	Автомобиль Peugeot Traveller (RU) Business L3 2.0 HDI BVA Z8TVEAHXVMM031442, 2022 года выпуска	44 500,00
2	Легковой автомобиль внедорожник универсал (SUV UNIVERSAL) LAND-ROVER RANGE ROVER-EVOQUE, 2021 года выпуска, VIN: SALZA2BN1MH149929, бывший в эксплуатации	44 900,00

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронного аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **ООО «Индустрия Инноваций»**

Шаг электронного аукциона – 5 % от начальной цены лота

Информация об имуществе, условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней со дня завершения электронного аукциона

Условия оплаты предмета электронного аукциона: единовременная оплата в течение 5 (пяти) календарных дней после проведения электронного аукциона.

Переход права собственности – после полной оплаты имущества

Электронный аукцион проводится в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу: https://iintorgi.by

Победитель электронного аукциона либо претендент на покупку обязан возместить организатору электронного аукциона затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере **2 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения электронного аукциона

Организатор электронного аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения электронного аукциона

Объект электронного аукциона не находится под арестом, судебный спор по нем не ведется, отсутствуют обременения третьих лиц

Дата и время проведения электронного аукциона: 11.03.2025 начало электронного аукциона 10.00, окончание электронного аукциона 16.00, электронный аукцион продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона. Электронный аукцион проводится на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 07.02.2025 по 10.03.2025 г. до 16.00
Контактные телефоны	**тел: +375 17-300-90-03, +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by**

В газете «Звязда» № 18 (30406) от 28.01.2025 (стр. 12) ООО «Фрондера» было размещено извещение о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Память-В», назначенного на 07.02.2025 в 14.30. В лоте № 1797 неверно указана информация о земельном участке, по этой причине внесены изменения: лот расположен на земельном участке с кадастровым номером 621350100005000034, площадь 1,7882 га, целевое назначение – для обслуживания зданий и сооружений, на праве постоянного пользования. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрической сети, код – 5,2, площадь – 0,2306 га. Подробнее о торгах по тел. +375293042560.

УНП 192789344

ОАО «Витебсклес»

извещает акционеров о проведении очередного собрания акционеров **13 марта 2024 года в 11.00** по адресу: г. Витебск, ул. Ленинградская, д.119-А

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год и определение основных направлений деятельности Общества в 2025 году.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2024 год.
4. Распределение прибыли Общества за 2024 год.
5. О направлениях использования прибыли Общества за 2025 год и в 1-м квартале 2026 года.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по местонахождению Общества (г. Витебск, ул. Ленинградская, 119А, приемная) в рабочие дни в период с 03 марта по 12 марта 2025 года с 9.00 до 16.30, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 01 марта 2025 года.

Регистрация участников собрания проводится с 09.30 до 10.45 по месту проведения собрания. Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность, а для представителей акционеров – и доверенности.

УНП 300029146

ЦАНУ ДЫКТУЕ НЕ ЗБОР, А РЫНАК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Трэба адзначыць, што гэты нарматыўны акт быў чаканым для большасці ўдзельнікаў рынку. Пытанне аб уніфікацыі парадку налічэння і аплаты ўтылізацыйнага збору з транспартных сродкаў у рамках ЕАЭС і асабліва з Расійскай Федэрацыяй ужо даўно стаяла на парадку дня. Праўда, гатоўнасць яго суб'ектаў не зрабіла падзею лёгкай, асабліва гэта датычыцца беларускіх грамадзян, якія збіраліся ў новым годзе абнавіць свой індывідуальны аўтапарк.

АХАРАКТАРЫЗУЕМ КОРАТКА ПРЫНЯТЫЯ НАВАЦЫІ

● **Па-першае.** Найбольшы рэзананс выклікала павышэнне ставак утылізацыйнага збору на імпартаваныя легкавыя аўтамабілі з рухавікамі ўнутранага згарання (РУЗ) не толькі для машын, што імпартуюцца з-за меж ЕАЭС (Кітай, ЗША, Еўропа, Паўднёвая Карэя і гэтак далей), але таксама з краін саюза (Арменія, Казахстан, Расія, Кыргызстан). Аднак ёсць адно прынцыповае ўдакладненне. Беларускія грамадзяне, якія купляюць аўто для сябе, па-ранейшаму будуць плаціць ільготны ўтыльзбор (544,5 BYN). Праўда, калі беларускі аўтаўладальнік вырашыць перапрадаць яго да скончэння 12 месяцаў, то будзе змушаны даплаціць утыльзбор да памеру камерцыйнага.

Для даведкі

Утылізацыйны збор быў уведзены ў Беларусі ў сакавіку 2014 года ў адпаведнасці з Указам № 64 ад 4.02.2014 г. Утылізацыйны збор у Беларусі выплачваецца юрыдычнымі і фізічнымі асобамі пры ўвозе транспартнага сродку на тэрыторыю краіны. Збор уведзены з мэтай забеспячэння фінансавання мерапрыемстваў па ўтылізацыі транспартных сродкаў пасля іх канчатковага зносу або вываду з эксплуатацыі.

● **Па-другое.** Для юрыдычных асоб (гаворка ідзе аб афіцыйных імпарцёрах) усё нашмат сур'ёзней. Калі раней для дылераў дзейнічала стаўка, як і для фізічных асоб (544,5 BYN), то цяпер, напрыклад, для новых аўтамабіляў з аб'ёмам рухавіка ад аднаго да двух літраў давядзецца заплаціць 23 575,91 BYN. Рост больш чым значны.

● **Па-трэцяе.** Новыя стаўкі для ўсіх тыпаў гібрыдных легкавых аўтамабіляў уніфікаваныя са стаўкамі для аўтамабіляў з РУЗ. Такім чынам, стаўку як для аўтамабіляў з РУЗ, так і для гібрыдаў цяпер вызначае аб'ём рухавіка. Але «чыстыя» электракары захаваюць сваю прывабнасць.

● **Па-чацвёртае.** Пастановай зменена ўзроставая дыферэнцыяцыя транспартных сродкаў. Калі раней ранжыраваліся стаўкі ўтыльзбору для аўто трох узроставых груп (да трох гадоў; ад трох да сямі гадоў; старэйшыя за сем гадоў), то з уступленнем у сілу змяненняў узроставых груп будзе толькі дзве (да трох гадоў уключна і старэй за тры гады).

● **Па-пятае.** Змяненні закранулі не толькі легкавы транспарт, але і іншыя самаходныя машыны: сельскагаспадарчую, грузавую і камерцыйную тэхніку. У прыватнасці, гэта адносіцца да пікапаў масай звыш 2,5 тоны, але менш за 3,5 тоны. Калі раней утыльзбор на іх складаў 18 653 BYN і 27 137 BYN, то новыя стаўкі будуць 29 514,04 BYN (да трох гадоў) і 46 258,09 BYN (старэй за тры гады) адпаведна. У гэты пералік трапілі квадрацыклы і снегаходы, якія раней хоць і растаможваліся на агульных падставах, аднак выплачваць утылізацыйны збор на іх не патрабавалася. Цяпер іх уладальнікі будуць абавязаны ажыццяўляць гэты плацеж.

● Прысядзібныя машыны таксама будуць абкладацца ўтылізацыйным зборам — у выпадку менш за тры гады стаўка складзе 2 437,43 BYN, для больш узроставых ужо 10 968,41 BYN. Праўда, калі максімальная магутнасць менш за 30 л. с., ці 22 кВт, то аплачваць утыльзбор не прыйдзецца.

Да гэтай жа катэгорыі адносяцца і самаходныя касілкі для саду і лецішча.

Чым абгрунтавана такая ўвага да дадзенага сегмента? Магчыма, урад тым самым пасылае сігнал айчыннаму бізнесу: гэтая прадукцыя з'яўляецца прывабным сегментам для імпартазамяшчэння.

ЧАКАНЫЯ НАСТУПСТВЫ

Адназначна скароцяцца так званыя шэрыя продажы, у першую чаргу легкавых аўтамабіляў, што прывядзе да росту бюджэтных паступленняў і дэкрыміналізацыі рынку.

Для даведкі

Ільгота ў выглядзе вызвалення ад выплаты ўтыльзбору ў адпаведнасці з Падатковым кодэксам прадастаўлена ў адносінах да транспартных сродкаў, вырабленых на тэрыторыі Беларусі арганізацыямі, якія прынялі на сябе абавязацельства забяспечыць наступнае бяспечнае абыходжанне з адходамі, якія ўтвараюцца ў выніку страты транспартнымі сродкамі сваіх спажывецкіх уласцівасцяў. У сувязі з чым павышэнне ставак утыльзбору не паўплывае на аўтамабілі, што вырабляюцца такімі беларускімі арганізацыямі, як ААТ «МАЗ», СЗАТ «Белджы», ААТ «Мінскі завод колавых цягачоў», ААТ «Лідскія аўтобусы «Нёман» і інш.). Гэта забяспечыць адсутнасць росту цэн на прадукцыю такіх заводаў, што створыць ім канкурэнтныя перавагі ў асобных сегментах рынку транспартных сродкаў.

Рост ставак утылізацыйнага збору, верагодна, у каротказтэрміновай перспектыве прывядзе да цэнавага і кольканаснага «замарожвання» айчыннага рынку новых легкавых аўтамабіляў. Пры гэтым відавочна, што падрасце доля легкавых аўтамабіляў, якія вырабляюцца ў Рэспубліцы Беларусь, і асобных марак і мадэляў, што ствараюцца ў Саюзнай дзяржаве, на якія ўтылізацыйны збор плаціць увогуле не трэба.

У каротказтэрміновай перспектыве шэраг беларускіх імпарцёраў, якія аплацілі пастаўкі аўтамабіляў, але не паспелі завезці іх на мытную тэрыторыю Рэспублікі Беларусь да 10.02.2025 г., могуць сутыкнуцца з фінансавымі праблемамі. Асабліва для тых катэгорый пакупнікоў, якія ўжо ўнеслі авансавыя плацяжы за чаканыя машыны.

Але, паўтаруся, у цэлым верагоднасць таго, што цэны на новыя машыны з Еўропы і ЗША на ўнутраным рынку Беларусі ўмомант вырастуць, захоўваецца нязначнай. Хоць бы таму, што рынак прапаноў практычна на ўсю гаму транспартных сродкаў цяпер перанасычаны.

Тым больш у 2025 годзе беларусы змогуць набыць аўтамабілі Belgee, якія ў 2024 годзе занялі больш за палову ад усяго аб'ёму продажаў айчыннага рынку новых аўтамабіляў, з дапамогай ільготнага крэдыту. Гэтую праграму прадоўжыў кіраўнік дзяржавы, падпісаўшы 28 студзеня адпаведны ўказ.

Такім чынам, якія наступствы прынясе новай пастановы ў цэлым для рынку, даведаемся вельмі хутка. **Адно зразумела: радавы спажывец, які набывае аўто для асабістага карыстання, практычна не пацерпіць. Увоз машыны дазволены, утыльзбор у гэтым выпадку будзе льготным, а калі праз год з моманту набыцця аўтамабіля ён захоча яго прадаць, у тым ліку за межы Беларусі, то зрабіць гэта зможа бесперашкодна з тым жа малым утыльзборам.**

Але ў любым выпадку, калі вы плануеце куплю новага сямейнага аўтамабіля, усё ж азнаёмцеся з новымі правіламі і пералічыце выдаткі.

Георгій ГРЫЦ,
кандыдат эканамічных навук.

РАЗУМНЫЯ ГРОШЫ

КУРС ДОЛАРА Ў АБМЕННІКАХ НІЖЭЙШЫ, ЧЫМ НА БІРЖЫ

Няўжо насельніцтва паціху адварочваецца ад гэтай валюты?

Некаторы час таму фінансавыя эксперты (ды і нашы чытачы таксама) заўважылі нязвыклыя для беларускай рэальнасці курсы ў абменніках. Долары банкі цяпер прадаюць ніжэй курсу Нацбанка. Як гэта зразумець?

Ужо на працягу некалькіх дзён курс гэтай валюты ў абменных пунктах сапраўды больш чым на капейку ніжэйшы, чым курс, які бывае на біржы.

У камерцыйных банках кажуць, што тлумачэнне тут самае простае: курс вызначаецца ў тым ліку зыходзячы з балансу попыту і прапановы. Пры прыняцці курсаў банкі арыентуюцца не толькі на курс Нацбанка і таргі, але і на курсы канкурэнтаў. Валюта банкам патрэбна для бізнес-мэт — напрыклад, для міжнародных плацяжоў. Калі попыту на іх няма, то і валюты трэба менш.

Пра што гэта можа сведчыць? Як адзначаюць спецыялісты айчыннага фінансавага рынку, справа ў тым, што ўнутры банкаўскай сістэмы запатрабаванасць долара і еўра рэзка знізілася. Аперацыі па разліках і пераводах у такіх валютах за межы Беларусі рэзка скараціліся. Крэдытаванне ў гэтых грашовых адзінках таксама зводзіцца да нуля. А насельніцтва, якое заўсёды падтрымлівала попыт на долары і еўра, вось ужо амаль два гады запар, па даных Нацбанка, выступае «чыстымі прадаўцамі».

Цалкам зразумела, што ў такіх умовах і долары, і еўра становяцца цяжкімі актывамі для банкаўскай сістэмы, што змушае ўстанаўліваць заніжаныя курсы наяўнай валюты. І відавочна, што такая сітуацыя будзе захоўвацца датуль, пакуль гэта валюта зноў не вернецца ў актыўны фінансавы абарот.

Існуе яшчэ адна версія гэтага валютнага кульбіту. У лістападзе ў некаторых краінах, у прыватнасці, у Турцыі, Арменіі, Тайландзе, Егіпце і ААЭ, турысты пачалі часта сутыкацца з адмовамі ў прыёме наяўных долараў. Там патрабуюць долары новага ўзору без пацёртасцяў, плям і старонніх надпісаў.

У Асацыяцыі беларускіх банкаў запэўнілі, што ў Беларусі не ўводзілі абмежаванняў на прыём банкнот старога ўзору. Аднак, як мы пераканаліся, на практыцы цяпер касіры больш старанна вывучаюць купюры, якія хочуць здаць грамадзяне. На самай справе старыя долары прымаюць толькі на камісію. А гэта мінус 5—10 % ад наміналу.

Ёсць і трэцяя версія нашай сітуацыі. Цяпер ва ўмовах санкцый банкі сутыкаюцца з праблемамі захоўвання і абмену наяўных долараў. Эксперты ўдакладняюць, што да нядаўніх часоў у Беларусі ў банкаў у ходзе былі дзве «формы» долараў. Адны знаходзіліся на карэспандэнцкіх рахунках замежных банкаў, даступныя для міжнародных разлікаў, іншыя — на ўнутраных карэспандэнцкіх рахунках, якія можна выкарыстоўваць для продажу на Беларускай валютна-фондавай біржы, крэдытавання кліентаў, але не для вонкавых плацяжоў.

Раней наяўныя долары можна было лёгка пераўтварыць у безнаяўныя ў Беларусі, прадаўшы з мінімальнай камісіяй іншым банкам. А цяпер ва ўсіх банках так шмат «кэшу», што даводзіцца прадаваць яго «ніжэй» рынку. Такім чынам, можна атрымаць беларускія рублі і ўжо на біржы купіць за іх безнаяўныя долары. Гэта своеасаблівая камісія за перавод папяровых замежных грошай у лічбавыя.

Магчыма, і ў гэтым меркаванні ёсць логіка. У любым выпадку захоўваць свае зберажэнні нашым людзям лепш у айчыннай валюце. А гэта ўжо факт.

Сяргей КУРКАЧ.

НА КАРТКУ, НА ПОШЦЕ ЦІ З ДАСТАЎКАЙ ДАДОМУ

Якія ёсць спосабы атрымання пенсіі?

Нагадаем, што не так даўно пачалі дзейнічаць змяненні, пры якіх пенсіянеры, не старэйшыя за 70 гадоў, якія жывуць у гарадах, пачалі атрымліваць свае пенсіі толькі праз банк. Але гэта не значыць, што альтэрнатыўныя спосабы атрымаць свае грошы перасталі існаваць. Заўсёды ёсць магчымасць скарыстацца іншымі каналамі. Аб тым, якія спосабы дзейнічаюць у краіне для атрымання пенсіі, расказалі ў Мінпрацы і сацабароны.

У прыватнасці, праз банк з 1 ліпеня 2024 года пачалася выплата пенсій тым пенсіянерам ва ўзросце да 70 гадоў, якія пражываюць у гарадах. Ім выплата пенсіі ажыццяўляецца праз базавы банкаўскі рахунак, адкрыты для яе атрымання як з выпускам карткі, так і без яе выпуску.

Маюць выбар атрымліваць пенсію на пошце (у тым ліку з дастаўкай дадому) або праз банк наступныя катэгорыі:

— інваліды;

— пенсіянеры, якія пражываюць у сельскай мясцовасці;

— грамадзяне ва ўзросце, старэйшым за 70 гадоў;

— тыя, хто мае абмежаваныя здольнасці да самастойнага перамяшчэння, якое адпавядае функцыянальнаму класу 3 і вышэй;

— грамадзяне, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў і атрымліваюць дапамогу па доглядзе гэтага дзіцяці-інваліда;

— а таксама тыя, хто зарэгістраваны па месцы жыхарства ў адным жылым памяшканні з інвалідам I групы, якія атрымліваюць пенсію праз аб'ект паштовай сувязі;

— тыя, хто не мае дакументаў, якія сведчаць асобу, у дачыненні да якіх органамі ўнутраных спраў выдадзены заключэнні аб пацвярджэнні асобы для мэт пенсіянага забеспячэння.

У Мінпрацы патлумачылі, што выдаткі на дастаўку (выплату) пенсій праз пошту ўсім вышэйназваным катэгорыям грамадзян ажыццяўляюцца за кошт сродкаў бюджэту Фонду сацыяльнай абароны.

Пры гэтым у ведамстве дадалі, што, калі грамадзянін, які пражывае ў горадзе і не адносіцца да вышэйпералічаных катэгорый, усё ж такі жадае атрымліваць пенсію праз пошту, мае такую магчымасць, але з аплатай за кошт уласных сродкаў паслугі па выплаце (дастаўцы) пенсіі па пошце.

Які кошт такой паслугі?

— Тарыфы за выплату або дастаўку пенсій прымяняюцца толькі ў дачыненні да грамадзян, якія абралі спосаб атрымання пенсійных выплат праз пошту з аплатай паслугі за кошт уласных сродкаў, — адзначылі ў Мінпрацы і агучылі адпаведныя сумы. — Пры выплаце пенсіі ў аперацыйнай касе пошты — 1,8 рубля; пры дастаўцы пенсіі дадому — 8,5 рубля.

Трэба дадаць, што плата будзе спаганяцца за кожную выплату або дастаўку пенсій.

РУП «Институт недвижимости и оценки»
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)

извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ЗАО «АТЛАНТ»** (Продавец)

Электронные торги состоятся 25.02.2025 в 10.00

Лот № 1: машино-место № 20 с инв. № 500/D-708120687, общая площадь – 13,2 кв. м. **Адрес**: г. Минск, ул. Гвардейская, 1-132. **Начальная цена продажи** – 32 294,46 руб. с учетом НДС 20 %. **Задаток** – 3 000,00 руб.

Лот № 2: литер А 1/к, автомобильная надземно-поздземная стоянка на 289 машино-мест с инв. № 500/С-34746, общая площадь – 10 572,3 кв. м. Земельный участок: кадастровый № 500000000007007981; площадь (га): 0,7988. Право аренды с 11.12.2017 по 30.09.2050. **Адрес**: г. Минск, ул. Саперов, 3. **Начальная цена продажи** – 8 678 147,22 руб., с учетом НДС 20 %. **Задаток** – 800 000,00 руб.

Шаг электронных торгов – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП). Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 20.02.2025 в 16.00

Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by Электронный адрес ЭТП: gostorg.by

РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«eVOлюция желаний»

Сведения об Организаторе рекламной игры: общество с ограниченной ответственностью «Яскрава», УНП 191548102, зарегистрировано 16 ноября 2011 года Минским горисполкомом.

Местонахождение Организатора: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902.

Наименование рекламной игры: «eVOлюция желаний». Рекламная игра зарегистрирована Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, выдано Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры от 10.12.2024 № 4498.
Период проведения рекламной игры: с 13.12.2024 по 13.03.2025.
Количество участников рекламной игры составило 18 человек.
Розыгрыш призов был проведен 20 января 2025 г. в 16:00 по адресу: г. Минск, ул. Богдановича 155В, пом. 6.

Победитель, выигравший Приз:
Автомобиль: AVATR 12. Год выпуска: 2024, VIN: LS6EKG0Y2RA554672, Цвет: черный. Страна происхождения: Китайская Народная Республика. Стоимостью 150 000,00 (сто пятьдесят тысяч) белорусских рублей + денежные средства в размере 22 379,43 (двадцать две тысячи триста семьдесят девять) белорусских рублей 43 копейки: Фомченкова Е. А.

Призовой фонд разыгран полностью.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры 7000.

Правила рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» № 242 (30376) от 12.12.2024 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Мирополье» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже

зерносклада с инвентарным номером № 610/С-66006 общей площадью 3 889,8 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620887400001000881 площадью 1,4900 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, 64 вблизи деревни Житьково.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, пл. 1,49 га, охранная зона электрических сетей, пл. 0,1314 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 166 093,62** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 16 609,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by

Аукцион состоится **11.03.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.03.2025** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320. **Тел: (8017)516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра: 8(01777) 9-13-01, 8(044) 555-25-91.**

УНН 600134365

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении электронного аукциона

Государственное предприятие **«Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова 5, каб. 321), по поручению **ОАО «Агрокомбинат «Дзержинский» филиал «Минский»** (продавец, местонахождение: 223043, Минская область, Минский район, п/о Большевик) проводит открытый аукцион по продаже транспортных средств, расположенных по адресу: Минский р-н, п/о Большевик

Лот № 1: легковой автомобиль внедорожник универсал SUZUKI GRAND VITARA,
2008 г. в., регистрационный знак 7771 ВТ-5,
кузов (VIN) № JSAJTD54V00269359, цвет серебристый,
инв. № по бух. учету 5629.
Начальная цена с НДС (20 %) – 11 160,00 бел. руб.
(задаток 10 % от начальной цены – 1 116,00 бел. руб.).

Лот № 2: автомобиль грузовой самосвал МАЗ-551605, 2009 г. в.,
регистрационный знак АІ 3244-5,
кузов (рама) № Y3M55160590015937, цвет белый,
инв. № по бух. учету 5839.
Начальная цена с НДС (20 %) – 29 640,00 бел. руб.
(задаток 10 % от начальной цены – 2 964,00 бел. руб.).

Лот № 3: автомобиль грузовой самосвал МАЗ-551605,
2009 г. в., регистрационный знак АС 3528-5,
кузов (рама) № Y3M55160590016073,
цвет белый, инв. № по бух. учету 6178.
Начальная цена с НДС (20 %) – 44 640,00 бел. руб.
(задаток 10 % от начальной цены – 4 464,00 бел. руб.).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере **5 (пяти)** процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608, и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, rlt.by

Электронные торги состоятся **11.03.2025** в **10.00**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.03.2025** до **17.00**. **Тел: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра 8(029) 116 45 00.**

УНП 601088545

ИНФОРМАЦИЯ О ПРЯМОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛОГО ДОМА

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами»

ПРОДАЕТСЯ:
по адресу: **д. Беличаны, ул. 3 Июля Березинского района Минской области одноэтажный деревянный одноквартирный жилой дом** общей площадью 72,0 м², с хозяйственной постройкой, процент износа 70 %.

Цена жилого дома — одна базовая величина 42.00 (сорок два белорусских рубля 00 копеек).

Обращаться в Березинский сельский исполнительный комитет: 223311, Республика Беларусь, Минская область, г. Березино, ул. Октябрьская, 39, berezss@berezino.gov.by, телефон председателя 8 (01715) 6 83 46, главного специалиста — 8 (01715) 6 83 45.

Претендентом на покупку пустующего дома до истечения 30 календарных дней со дня опубликования сведений о прямой продаже пустующего жилого дома представляются лично либо через своего представителя **в сельский исполнительный комитет по местонахождению дома следующие документы:**

заявка на покупку пустующего дома по форме, установленной Государственным комитетом по имуществу (Постановление Государственного комитета по имуществу Республики беларусь от 23 сентября 2021 г. № 23 «О формах документов);

гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течении года до подачи заявки) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должна быть засвидетельствована нотариусом или лицом, уполномоченным совершать нотариальные действия), доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика должны быть засвидетельствованы нотариусом или лицом, уполномоченным совершать нотариальные действия).

Документы, составленные за пределами Республики Беларусь в соответствии с законодательством иностранного государства, должны быть легализированы, если иное не предусмотрено законодательством.

В случае поступления двух или более заявок от претендентов на покупку пустующего дома, его продажа будет осуществляться по результатам аукциона.

Затраты по прямой продаже жилого дома, связанные с опубликованием объявления о прямой продаже жилого дома, возмещаются покупателем жилого дома

УНП 600040856

ШЛЯХ У БУДУЧЫНЮ

У СУСВЕТНЫМ ТОП-10

— Трэба працаваць на нацыянальную эканоміку, каб не абмяжоўвацца нічым у суправаджэнні і развіцці інтэлектуальных прадуктаў і сістэм, — падкрэсліў дырэктар АІПІ НАН Беларусі Сяргей Круглікаў.

У інстытуце працуе 25 навукова-даследчых лабараторый, якія забяспечваюць работу большай часткі эканамічных суб'ектаў краіны.

— Усе міністэрствы і ведамствы рэспублікі ў той ці іншай ступені выкарыстоўваюць прадукцыю АІПІ, — канстатаваў кіраўнік інстытута. — Сёння нашымі распрацоўкамі ахоплены практычна ўсе сферы дзейнасці, звязаныя са штучным інтэлектам. У галіне апрацоўкі выяў наша каманда ўваходзіць у сусветны топ-10. Колькасць такіх каманд па ўсім свеце складае больш за 2 тысячы, і мы — сярод найлепшых.

ПАРАЗВАЖАЕМ АБ ПЕРСПЕКТЫВАХ

Сярод найважнейшых кірункаў работы навукоўцаў у сферы высокіх тэхналогій Сяргей Круглікаў назваў інтэлектуальную сельскую гаспадарку, ахову здароўя, аэракасмічны маніторынг і інфармацыйную бяспеку.

Сёння навука павінна быць практыкаарыентаванай, гэта патрабаванне часу, падкрэсліў вучоны. «Цяпер літаральна прымаецца рашэнне аб тым, што кожная навукова-даследчая праца не павінна весціся больш за год і павінна мець практычны выхад на той ці іншы доследны ўзор, метадычнае кіраўніцтва. Гэта значыць, быць прывязанай да эканомікі», — адзначыў ён. У якасці прыкладу можна прывесці сістэму аўтаматычнага сартавання яблыкаў.

— Каля 80 розных сартоў яблыкаў, а таксама іх хваробы наша сістэма з даволі высокай верагоднасцю распазнае, адсейвае і сартуе. Хуткасць высокая — каля двух з паловай тон у гадзіну. Алгарытмы пастаянна ўдасканальваюцца, — распавёў навуковец.

Яшчэ адна практычная распрацоўка «для жыцця» — платформа KrokApp для айчынных і замежных турыстаў. ІТ-платформа дазваляе даведацца пра цікавыя факты з гісторыі беларускіх населеных пунктаў, атрымаць практычную інфармацыю, неабходную падарожнікам. KrokApp ператварае нашу краіну ў вялікі «разумны дом» — зразумелы, дынамічны і сучасны. Сёння яна змяшчае інфармацыю аб 70 гарадах краіны.

— Платформа бясплатная і знаходзіцца ў адкрытым доступе, — распавёў дырэктар АІПІ. — Пачалі мы з гістарычных месцаў, потым перайшлі да навігацыі і гукавога суправаджэння праекта. Цяпер на гэтую платформу накладваем карту крыніц Беларусі, арэалаў пражывання птушак і зімавальных ям рыб.

Але не застаюцца без увагі і распрацоўкі на перспектыву — у прыватнасці, асаблівая ўвага сёння аддаецца робататэхніцы.

— Гэта вельмі дарагая галіна, — канстатуе кіраўнік інстытута. — Цяпер мы займаемся стварэннем антрапаморфнага робата. Таксама распрацаваны 3D-прынтар, аналага якому па памерах дэталяў, што вырабляюцца, у СНД няма. Пакуль ён выкарыстоўваецца для патрэб Нацыянальнай акадэміі навук. Калі будзе патрэба, гатовыя гэтую тэматыку развіваць і далей.

Акрамя таго, візіткай Беларусі з'яўляецца апрацоўка маўлення.

— У нас ужо ёсць платформа з больш як 70 сэрвісамі, якімі можна скарыстацца. У тым ліку ёсць і беларускамоўны ШІ-асістэнт. Гэты кірунак актыўна развіваецца ў нашым інстытуце.

> **Але тое, што кардынальным чынам змяняе да лепшага жыццё людзей, — гэта сучасныя тэхналогіі ў сферы аховы здароўя, падкрэсліў вучоны.**

Яны забяспечваюць хуткасць і дакладнасць атрымання лячэння і рэабілітацыі, правільны алгарытм дзеянняў медыкаў.

ЛІЧБАВЫЯ РАШЭННІ ДЛЯ МЕДЫЦЫНЫ

Больш як 30 інфармацыйных сістэм і службаў у сферы аховы здароўя ўжо працуюць для патрэб краіны, горада, асобнай установы, канстатаваў **Андрэй ЯРМОЛЕНКА, загадчык лабараторыі інфармацыйна-аналітычных сістэм АІПІ НАН Беларусі.** Напрыклад, у сталіцы ўжо некалькі гадоў функцыяніруе адзіная лабараторная інфармацыйная сістэма, прывёў ён прыклад. Працуюць у Беларусі і аналагічныя сэрвісы па біяпсіі, хуткай медыцынскай дапамозе.

— У адпаведнасці з распараджэннем Прэзідэнта цяпер вядзецца распрацоўка цэнтралізаванай інфармацыйнай сістэмы аховы здароўя, — распавёў навуковец. — Распрацоўшчыкам пяці яе падсістэм з'яўляецца АІПІ НАН Беларусі. У тым ліку мы распрацоўваем адзіны архіў медыцынскіх выяў.

Запуск цэнтралізаванай сістэмы аховы здароўя плануецца да канца 2025 года.

У цэлым, медыцынская сфера — у прыярытэце ў беларускіх айцішнікаў.

— Апошнія пару гадоў мы ўваходзім у 2 % найлепшых у сусветным рэйтынгу па апрацоўцы біямедыцынскіх выяў — КТ, МРТ, — канкрэтызаваў Андрэй Аляксандравіч.

— Для развіцця апрацоўкі відэавыяў у нас працуе цэлы шэраг лабараторый, — дадаў Сяргей Круглікаў. — У гэтай галіне мы можам вырашаць 90 % задач. Мы таксама ганарымся сістэмай «Электронны рэцэпт», якая за два гады не мела ніводнага збою. Яна паспяхова перададзена нашым кампаньёнам у РНПЦ медыцынскіх тэхналогій, інфарматызацыі, кіравання і эканомікі аховы здароўя.

ТЭХНАЛОГІІ ДЛЯ КОСМАСУ

Сёння Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі — асноўная навуковая ўстанова па вядзенні праграм Саюзнай дзяржавы. Усяго праграм было дзевяць, чатыры з іх — у галіне суперкамп'ютарных тэхналогій.

— Беларусь ужо досыць даўно, 20 гадоў таму, уступіла ў Клуб суперкамп'ютарных дзяржаў, — падкрэсліў Сяргей Круглікаў. — У ліку ўсяго дзевяць краін. Наша краіна валодае ўласнымі суперкамп'ютарнымі тэхналогіямі, а не проста выкарыстоўвае іх.

У 2024 годзе Беларусь стала таксама касмічнай дзяржавай, дадаў ён. Цяпер на стадыі рэалізацыі пятая навукова-тэхнічная праграма Саюзнай дзяржавы ў галіне космасу. Яна прадугледжвае стварэнне шматспадарожнікавых груповак малапамерных касмічных апаратаў назірання зямной паверхні і калязямной касмічнай прасторы.

— Адзін з такіх апаратаў распрацаваны нашым даччыным прадпрыемствам «Геаінфармацыйныя сістэмы». Вядзецца зборка і адладка, працэс падрыхтоўкі да запуску. Апарат прызначаны для вывучэння іонасферы — малавывучанай у сусветнай практыцы галіны. Гэтыя даныя неабходны Беларусі, якая з'яўляецца ядзернай дзяржавай, паколькі мае атамную электрастанцыю, — падкрэсліў навуковец.

> **Акрамя беларускага малога спадарожніка, які ўжо практычна гатовы да запуску, ёсць у інстытута таксама цэлы шэраг распрацовак у галіне штучнага інтэлекту для космасу, адзначыў дырэктар:**

— Гэта розныя мікрамодулі, якія дазваляюць у аўтаматычным рэжыме распазнаваць і паведамляць інфармацыю — яны пабудаваны на нейрасетках, якія спачатку навучаюцца, а потым у палегчаным выглядзе запісваюцца на адпаведныя кантролеры.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ёсць чым ганарыцца

Беларускі флагман у галіне інфармацыйных тэхналогій 60 гадоў таму ствараўся па даручэнні ўрада Савецкага Саюза на базе Акадэміі навук БССР.

— Калі мы гаворым пра інтэлектуальныя тэхналогіі і штучны інтэлект, якія цяпер у фокусе ўвагі, важна разумець, што асновы закладваліся 20—30 гадоў таму, і сёння мы атрымліваем вынікі тых намаганняў, якія прыкладалі навукоўцы на світанку станаўлення гэтых тэхналогій, — падкрэсліў Андрэй Ярмоленка.

Радыёлагі ЗША і Еўрасаюза праходзяць навучанне, вывучаюць манаграфію па біямедыцынскіх малюнках, прывёў прыклад навуковец.

— Адна з глаў гэтай манаграфіі напісана супрацоўнікам нашага інстытута. Такім чынам, апошнія гадоў 20 радыёлагі практычна ўсяго свету вывучаюць магчымасці апрацоўкі медыцынскіх выяў у тым ліку па напрацоўках беларускіх навукоўцаў, — адзначыў ён.

ЗОРКА МАЛЕНЬКАГА ПРЫНЦА

Як у глыбінцы адкрываюць юныя таленты

Некалькі месяцаў таму аб невялікім горадзе Сянно, што ў Віцебскай вобласці, даведаліся мільёны тэлегледачоў канала НТБ. Паўфіналістам праекта «Ты супер!», у якім удзельнічаюць дзеці, што засталіся без апекі бацькоў, стаў выхаванец Сенненскага дзіцячага дома Ваня МАЛЬЦАЎ. А напрыканцы студзеня юная зорачка разам з Пятром Елфімавым і Мікалаем Лукашэнкам выканала на сцэне «Мінск-арэны» легендарную беларускую «Малітву» ў рамках канцэрта рэспубліканскай акцыі «Марафон адзінства». І, бадай, ніводны беларус не застаўся абыякавы.

Фота БелТА.

14-гадовы Ваня Мальцаў родам з Наваполацка, яго бацькі пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Клопат пра хлопчыка, яго сястру Лену і брата Дзяніса ўзяла на сябе бабуля, але справіцца з апякунскімі абавязкамі ёй аказалася не па сілах. Летам 2017-га года Іван разам з сястрой апынуліся ў Сенненскім дзіцячым доме, праз год да іх далучыўся і Дзяніс.

Для кіраўніцтва і педагогаў установы белавалосы хлопчык стаў прататыпам галоўнага героя казкі Антуана дэ Сент-Экзюперы. «Ваня вельмі інтэлігентны, менавіта гэта характарыстыка яму падыходзіць больш за ўсё. Наш Маленькі прынц унутры і звонку надзвычай далікатны, сціплы, але разам з гэтым валявы на шляху да пастаўленых мэт», — так характарызуе выхаванца дырэктар дзіцячага дома Ганна БРОЎКА.

Першай адоранасць Мальцава разгледзела тады музычны кіраўнік, а цяпер **дырэктар Сенненскай дзіцячай школы мастацтваў Ірына ІЛЬЮШЭНКА**. Калі ў шасцігадовым узросце хлопчык паступіў у дзіцячы дом, менавіта Ірына заўважыла ў ім здольнасці, прапанавала займацца музыкай і спяваць. Спачатку Ваня саромеўся, баяўся публікі, але ўсё ж палюбіў творчасць і сцэну. Ён хутка схоплівае мелодыю, запамінае тэкст. У дзіцячым доме Іван змог праявіць сябе не толькі як вакаліст, але і як вядучы мерапрыемстваў.

«Мы ўпарта трэніравалі прамоўніцкія здольнасці, артыкуляцыю, сцэнічную прамову і акцёрскае майстэрства. У пэўны момант парэкамендавала вучня ў Сенненскую дзіцячую школу мастацтваў. Там працягнулі яго развіццё і зрабілі свой унёсак у прафесійнае навучанне педагогі па вакале Анастасія Грынкіна, а затым і да сённяшняга дня Наталля Мефодзіенка», — успамінае творчы шлях юнака Ірына Сяргееўна.

Як навучэнец школы мастацтваў Іван неаднаразова перамагаў на вакальных конкурсах сярод дзіцячых устаноў мастацтваў Віцебскай вобласці. За сем сезонаў расійскага шоу «Ты супер!» нікому з выхаванцаў Сенненскага дзетдома не ўдавалася прайсці кастынг на праект, а ў Вані атрымалася з трэцяй спробы.

«Ад мяне першай Іван даведаўся, што мы едзем у Маскву. Было хвалявальна, паездка патрабавала аператыўнай падрыхтоўкі дакументаў і фінансавых выдаткаў. Але мы рэальна адчувалі падтрымку нашага калектыву і асабіста дырэктара Ганны Броўка, дзякуючы чаму ўсё і атрымалася. Мы пазнаёміліся з Масквой, шмат гулялі па горадзе. Нягледзячы на працоўны інтэнсіў і непрадбачаныя форс-мажоры, паездка была ў радасць. Выдатна, што існуе такі праект для дзяцей з няпростым лёсам, які раскрывае магчымасці творчага росту. Яшчэ не магу не сказаць, што мне імпануе характар Івана. Ён вельмі адказны, сур'ёзны, шчыры і клапатлівы, трохі стрыманы вонкава. З яго, думаю, вырасце годны чалавек, добры сем'янін, сапраўдны мужчына», — дзеліцца педагог.

Чатырнаццаты дзень нараджэння юны артыст сустрэў 10 верасня ў Маскве. Напярэдадні якраз паказалі ў эфіры выпуск праекта з яго выступленнем. З дзіцячага дома Івану перадалі падарунак, а таксама кветкі, паветраныя шары, салодкія пачастункі для сяброў па праекце. І хоць Ваня не стаў пераможцам, ён не апускае рукі і плануе вярнуцца ў студыю зноў.

Дарэчы, Мальцаў — не адзіная зорка дзіцячага дома: побач з ім у мясцовай плеядзе талентаў педагогі называюць імёны Ніны Міхайлоўскай, Ганны Целяпнёвай, Аліны Маслянскай, Дзмітрыя Ільюшэнкі, Ірыны Байковай і многіх іншых. У самастойным жыцці хтосьці з выпускнікоў працягвае займацца творчасцю як хобі, хтосьці абраў прафесію ў дадзеным кірунку. І гэта, пэўна, самая вялікая заслуга педагогаў, якія не толькі выхавалі добрых людзей, але і змаглі паспяхова развіць іх прыродныя здольнасці.

Жыццё Маленькі прынц з Віцебшчыны плануе звязаць толькі з музыкай. Напрыканцы студзеня яму выпала магчымасць выступіць перад тысячамі беларусаў на сцэне «Мінск-арэны» разам з Пятром Ялфімавым і Мікалаем Лукашэнкам. І гэта, прызнаецца хлопец, было тым яшчэ выпрабаваннем. «Выпрабаваннем на адказнасць і смеласць. Права выступіць на такой сцэне стала для мяне вельмі пачэсным і хвалюючым. Вельмі адчувальнай была падтрымка гледачоў, а калі адзін за адным у цемры сталі запальвацца ліхтарыкі, гэта было падобна на казку», — успамінае герой.

Нягледзячы на поспех, Ваня не захварэў на «зорнасць». Ён так жа працягвае вучыцца, удзельнічае ў раённых і абласных мерапрыемствах, любіць з братам і сястрой пагуляць у настольны тэніс. І вельмі марыць аб тым, каб ува ўсіх дзетак на свеце блізкія і родныя былі побач.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА. Фота з адкрытых крыніц.

ЧАС ПАКАЗАЦЬ СЯБЕ Ў ТАНЦЫ

IV Адкрыты рэспубліканскі конкурс харэаграфічнага мастацтва «Час танцаваць» ізноў збярэ 5 красавіка 2025 года аматараў і прафесіяналаў для чарговай дэманстрацыі іх здольнасцяў і талентаў. Напярэдадні старту адборачнага этапу арганізатары маштабнага праекта распавялі журналістам, чым будзе адметны ён сёлета і на што варта арыентавацца пры падачы заяўкі.

Фота БелТА.

Арганізатарам гэтага сацыяльна значнага праекта з 2022 года з'яўляецца Дзяржаўная ўстанова «Рэспубліканскі культурна-асветніцкі цэнтр» Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта. Конкурс прызначаны для папулярызацыі харэаграфічнага мастацтва ў Рэспубліцы Беларусь, далучэння людзей розных узростаў да багатай культурнай спадчыны нашай краіны і захавання пераемнасці танцавальных традыцый сярод маладога пакалення.

Як адзначыў **дырэктар Рэспубліканскага культурна-асветніцкага цэнтра Аляксандр СІДАРЭНКА,** сярод мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў сценах установы, праект «Час танцаваць» па-свойму адметны:

— Конкурс «Час танцаваць» займае асобнае месца, яго можна вылучыць сярод усіх іншых праектаў, паколькі большасць з іх праводзіцца для гледачоў, а тут — для ўдзельнікаў творчых харэаграфічных калектываў, — адзначыў Аляксандр Сідарэнка. — Сам па сабе конкурс дазваляе вызначыць самых лепшых сярод найлепшых, дае магчымасць удзельнікам падзяліцца назапашаным вопытам, расказаць пра сябе і даведацца нешта новае. Праведзена ўжо вялікая падрыхтоўчая работа, перапрацавана палажэнне конкурсу. Узрост удзельнікаў таксама крыху зменены, і цяпер самая меншая ўзроставая катэгорыя — ад 4 гадоў. Хочацца адзначыць тое, што кожны год узровень удзельнікаў расце, журы ўсё складаней выбіраць пераможцаў.

Чакаецца, што сёлета пра свой талент заявяць больш за 1000 удзельнікаў з розных рэгіёнаў краіны. І за званне найлепшых танцораў будуць змагацца ў пяці намінацыях: «Класічны танец», «Эстрадны танец», «Бальны танец», «Сучасны танец» і «Народны танец». Прэтэндэнтамі могуць быць салісты і танцавальныя калектывы з Беларусі і іншых краін, прычым як дарослыя, так і дзеці ў сваіх узроставых катэгорыях. Так, напрыклад, ужо падаў заяўку на ўдзел харэаграфічны ансамбль «Сюрпрыз» з Барнаула. Ужо вядома, што адзін з нумароў калектыву прысвечаны 80-годдзю Вялікай Перамогі. «Танец неба», прысвечаны лётчыцам 46-га Гвардзейскага авіяцыйнага палка, займае асаблівае месца ў творчасці калектыву. Ён дарагі яго выканаўцам не толькі з-за шэрагу высокіх узнагарод, але і таму што распавядае пра сапраўдных дзяўчат-гераінь. Вывучыўшы гісторыю, у калектыве даведаліся, што сярод лётчыц палка былі і беларускі... Ва ўсіх астатніх магчымасць заявіць пра сябе ёсць да 13 сакавіка 2025 года.

А майстэрства канкурсантаў ацэніць прафесійнае журы, у склад якога ўвойдуць аўтарытэтныя дзеячы культуры і мастацтва, арганізатары і партнёры праекта. Старшынёй экспертнай супольнасці будзе заслужаны дзеяч мастацтва Рэспублікі Беларусь, прафесар кафедры харэаграфіі БДУКМ Святлана Гуткоўская.

